змяшчаліся матэрыялы ў перыядычным друку. Дадзенае паведамленне сваёй мэтай ставіць пошук кола зацікаўленых асоб і арганізацый для правядзення пэўных мерапрыемстваў, у тым ліку пошукавых. Справа ў тым, што першапачатковыя спробы знайсці месца пахаванняў, а значыць і папярэдняе месца знаходжання пліт, аказаліся марнымі. А зрабіць гэта неабходна, калі мы прэтэндуем на званне цывілізаванага грамадства.

Робячы падсумаванне, зазначым наступнае:

- захаванне помнікаў нямецкім жаўнерам павінна стаць неад'емнай часткай аховы гістарычнай спадчыны нашай Бацькаўшчыны;
- вывучэнне нямецкіх пахаванняў часоў сусветных войнаў павінна заняць адпаведнае месца ў сістэме навуковых даследаванняў;
- далейшае вывучэнне помнікаў, знойдзеных у цэнтры г. Брэста, у прыватнасці ідэнтыфікацыя пахаваных, бачыцца нам магчымым пры далучэнні архіўных матэрыялаў Германіі і Польшчы, а таксама зацікаўленасці ў гэтым адпаведных нямецкіх дзяржаўных і навуковых устаноў.


Літаратура:

1. Вержховский Д.В., Ляхов В.Ф. Первая мировая война 1914-1918 гг. – М., 1964.
2. Ростунов И.И. Русский фронт Первой мировой войны. – М., 1976.
3. Мигун Д. Политика грабежа и насилия // Беларуская думка. – 2001. – № 8. – С. 145-147.
4. Платонаў Р. Пад пятой германскага кайзера // Беларускі гістарычны часопіс. – 2001. № 2, 5.
5. Карнялюк В. Гродзенскі эпізод Першай сусветнай вайны // Беларуска-нямецкае грамадска-культурнае ўзаемадзеянне: гісторыя, сучаснасць, перспектывы: Матэрыялы міжнароднага "круглага стала" (29-30 красавіка 1996 г.). – Мн., 1996. – С. 34-38.
6. Д. Ващукувна-Каменецка. Брест – город незабываемый. – Брест, 1999. – С. 91.


## КАНЦЭПЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў ДАСЛЕДАВАННЯХ САВЕЦКІХ ЭМІГРАНТАЎ У ГЕРМАНІІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XX СТ.)


Л.Ю. Малыхіна

*г. Брэст, БДТУ*


Складванне гістарыяграфічнай канцэпцыі беларускай дзяржаўнасці ў Германіі звязана з арганізаваным беларускім рухам пасля ўсталявання на Беларусі савецкай улады. Дзеячы і стваральнікі Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) сталі выдаваць ў замежжы літаратуру па гісторыі свайго народа, дзе заяўлялася пра імкненне беларусаў да пабудовы сваёй дзяржаўнасці. Яны пазнаёмілі еўрапейскія палітычныя і навуковыя колы з тагачасным становішчам Беларусі, апелявалі да сусветнай грамадскасці ў справе яго дзяржаўна-палітычных правоў.

Традыцыі нацыянальнай гістарыяграфіі пасля Другой сусветнай вайны працягвалі навукоўцы, якія апынуліся ў эміграцыі ў якасці сталых даследчыкаў (А.Адамовіч, Я.Станкевіч, В.Жук-Грышкевіч і інш.). Дзяржаўна-палітычныя зрухі на Беларусі пасля Кастрычніка 1917 г. знайшлі сваё адлюстраванне на старонках беларускамоўных выданняў Германіі – "Шляхам жыцця", "Бацькаўшчына" (Мюнхен), "Пагоня" (Зальцбург) і інш.

Першым зародкам арганізацыйнага афармлення творчых навуковых сіл стала Крывіцкае (Беларускае) навуковае таварыства Ф.Скарыны, створанае ў Рэгенсбургу (Германія) у 1947 г. у лагеры для перамешчаных асоб [1]. Гэтае таварыства, ініцыятарам якога быў Янка Станкевіч, наладзіла выпуск навукова-літаратурнай газеты "Веда", якая друкавалася пазней у Брукліне і Нью-Йорку [2]. Творчыя сувязі беларускай дыяспары ў ЗША і Германіі можна прасачыць на працягу ўсяго пасляваеннага перыяду. Так, для падтрымкі навуковай працы ў 1951 г. у Нью-Йорку быў заснаваны Беларускі інстытут навукі і мастацтва (БІНІМ), яго старшынёю з 1982 г. быў В.Кіпель, які пачынаў сваю дзейнасць у Германіі, а з 1955 г. у Нью-Йорку заняўся складваннем беларускай замежнай бібліяграфіі.

А ў Германіі важным цэнтрам гуртавання нацыянальных навукова-культурных сіл ў 1950-х гадах стаў Мюнхен (Баварыя), дзе працавалі беларускае выдавецтва "Бацькаўшчына" і самастойны аддзел БІНІМа (1955-1966 гг.).

Беларускія даследчыкі ўдзельнічалі ў рабоце Інстытута па вывучэнні СССР, створанага 8 ліпеня 1950 г. у Мюнхене ў выглядзе свабоднай карпарацыі вучоных, якія пакінулі СССР. Мэтаю савецкіх эмігрантаў было "развесці няведанне, якое існуе адносна СССР і выдаць дэмакратычнаму свету даставерныя дадзеныя" аб ім [3]. Працаваць у рамках інстытуту мог толькі той, хто не з'яўляўся членам Камуністычнай партыі і меў навуковую кваліфікацыю, незалежна ад месца жыхарства. Апошняе абумовіла тое, што ў мюнхенскіх выданнях публікаваліся аўтары з ЗША. Інстытут па вывучэнню СССР стаў цэнтрам карэспандэнцыі, дзе выдаваліся часопісы, манаграфіі, зборнікі артыкулаў, бюлетэнь па пытаннях грамадска-палітычнага жыцця СССР, пры ім арганізоўваліся канферэнцыі вучоных. Пры неабходнасці Інстытут аказваў матэрыяльную дапамогу эмігрантам. С.Станкевіч, В.Жук-Грышкевіч, А.Адамовіч, Ч.Сіповіч у якасці членаў асамблеі Інстытута прымалі ўдзел у вызначэнні напрамкаў працы, забеспячэнні яго выданняў беларускай праблематыкай.

Канцэпцыя беларускай гісторыі эмігрантаў у Германіі карэнным чынам адрознівалася ад той, што існавала ў савецкай гістарыяграфіі. Вучоныя звярталіся да складаных пытанняў, якія з прычыны ўціску афіцыйнай ідэалогіі скажаліся на Бацькаўшчыне: выток дзяржаўнасці беларусаў, нацыянальна-дзяржаўнае адраджэнне ў 1918-1920-е гг. (БНР, БССР, ЛітБел ССР), прычыны антысавецкіх пратэстаў у той час [4]. С.Кабыш (1958, Мюнхэн) у сваіх публікацыях закрануў праблему рэпрэсій і "генацыду" ў БССР. Гэтаму быў прысвечаны і так званы "Синодик": ахвяраў бальшавізму 1917-1922 гг., улажаны ў СССР "для келейного и храмового молитвенного поминовения", экзэмпляр якога ў 1975-1976 гг. трапіў на Захад і быў апублікаваны [5].

Для знаёмства грамадскасці Заходняй Еўропы з пытаннямі беларускай дзяржаўнасці друкаваліся таксама дакументы і матэрыялы. Каштоўнымі крыніцамі па праблемах усталявання рэспублікі сталі апублікаваныя ў Германіі дакументы па навейшай гісторыі Беларусі: "Кніга ахвяраў бальшавізму" (ФРГ, 1950), стэнаграма "Другога Усебеларускага кангрэса" (Мюнхен, 1954), дакументы і матэрыялы па БНР, якія друкаваліся ў газеце "Бацькаўшчына" за 1949-1950 гг. [6].

Даследаванні рэдактара "Бацькаўшчыны" Антона Адамовіча (Н.Недасека), які ў 1938 г. скончыў БДУ, раскрывалі ролю бальшавікоў у рэвалюцыйных падзеях на Беларусі, іх негатыўныя адносіны да нацыянальнага руху і шляхі ўстанаўлення "кантролю над Беларуссю". [7]. У прысвечанай І Усебеларускаму з'езду (снежань 1917 г.) брашуры А.Адамовіч пісаў: "Агульнанацыянальная, запраўдная "усебеларуская" рэпрэзэнтацыйнасць Кангрэсу не падлягае ніякай няпэўнасці"[8]. Галоўнай прычынай разгону з'езда аўтар лічыць "абвяшчэнне ім нашага краю асобным гаспадарствам у форме дэмакратычнае Беларускае Народнае Рэспублікі". Паводле Адамовіча, бальшавіцкая ідэялогія не мела каранёў на беларускай зямлі, і толькі абвяшчэнне БНР стала спробай "рэалізацыі сапраўдных інтарэсаў беларускага народа", а ўтварэнне БССР стала працівагай незалежніцкім ідэям у асяроддзі беларускіх патрыётаў [9]. Аб лёсе ўтваральнікаў БССР сведкі даюцца ў артыкуле "Камунізм і "беларускі нацыяналізм" [10]. Іншы, чым у савецкіх выданнях, падыход да асвятлення ролі нацыянальных дзеячаў назіраецца ў артыкуле А.Адамовіча, які з 1960 г. працаваў у ЗША, пра І.Луцкевіча [11].

Найбольшую вядомасць сярод перыядычных выданняў беларускай дыяспары ў Германіі набыў мюнхенскі "Беларускі зборнік". У артыкулах Станіслава Станкевіча [12], Г.Паланевіча [13], Паўла Урбана [14], якія былі надрукаваны ў ім, на прыкладзе БССР востра крытыкавалася савецкая нацыянальная палітыка і практыка бальшавізму. Толькі дзейнасць Рады БНР, упэўнены аўтары, прывяла да ўтварэння БССР.

Ян Станкевіч і Вацлаў Пануцэвіч (Мікола Волачіч) звярнуліся да праблемы, якую абыходзіла беларуская савецкая навука – гістарычнай тэрыторыі Беларусі, падзелу яе на часткі і ўключэння ў паслякастрычніцкі час у выніку палітычных меркаванняў суседніх краін у склад апошніх. У прыватнасці, Вацлаў Пануцэвіч зрабіў такі вывад – "паклíканьне да жыцьця БНР прадстаўнікамі ўсяго Беларускага народу ў мамэнце, калі нашыя суседзі хацелі прыкрыць яго сваімі "апякунчымі" крыламі, як дабрадзеі і збавіцелі, было сапраўдным самавызначэннем Беларускага народу, адкідаючым чужацкую "апёку" і чужацкую ідэялогію" [15]. Акупанты "не мелі ў сваіх планах адбудовы беларускай дзяржавы", і таму не дапусцілі дэлегацыі БНР на чале з А.Цвікевічам да ўдзелу ў нарадах ў Брэсце. Найбольшых поспехаў урад БНР дабіўся ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва і

замежнай дыпламатыі [16]. Да падобных высноў прыйшоў і Ісідор Плашчынскі (Менскі Язэп) – нямецкія акупацыйныя ўлады не маглі спрыяць палітычнаму замацаванню абвешчанай БНР [17]. Ён жа зрабіў вывад аб тым, што Актам ад 25 сакавіка 1918 года ідэя беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці была завершана і рэалізавана.

Прысвечаная 40-годдзю ўтварэння БССР 10-я кніга "Беларускага зборніка" (1959 г.) ахоплівае ўсе асноўныя падзеі на Беларусі за той час. На аснове крытычнага выкарыстання савецкіх выданняў (зборнікаў дакументаў і навуковых прац) у ёй разглядаюцца праблемы, звязаныя з утварэннем БССР (П.Урбан [18]), палітыкай КПБ (Я. Запруднік). Аўтары крытыкуюць тэзіс савецкіх гісторыкаў аб тым, што беларускі народ адразу прыняў камуністычныя ідэі і ўпершыню прыступіў да стварэння сваёй дзяржаўнасці пры савецкай уладзе; робяць высновы аб "чужым" паходжанні бальшавізму на Беларусі, завяршэнні канфлікту 1920-х "паміж беларускімі нацыянал-камуністамі і расейскімі бальшавікамі" масавымі неабгрунтаванымі рэпрэсіямі ў 1930-я г., пераўтварэнні КПБ у правінцыяльную арганізацыю ВКП(б). Яны адзначалі стан "нацыянальнага прыгнечання і дыскрымінацыі ў СССР", поўнага ігнаравання беларускіх нацыянальных інтарэсаў, фармальнасць суверэнітэту БССР ва ўсіх сферах. Доктар філасофіі Вінцэнт Жук-Грышкевіч, як і Я.Станкевіч, В.Пануцэвіч, А.Адамовіч, разглядаў абвяшчэнне БНР як акт аднаўлення беларускай дзяржаўнасці, падкрэсліваў уплыў беларускага нацыянальнага руху на ўтварэнне БССР. Сваю кнігу «25 сакавіка» ён прысвяціў БНР і 60-годдзю Усебеларускага з'езда [19].

Прыкметнае абуджэнне ў эмігранцкіх колах выклікаў выхад у Германіі першага гістарыяграфічнага даследавання Беларусі Я.Станкевіча. Прафесар Я.Станкевіч некалі выкладаў беларускую мову ва ўніверсітэтах – у Вільні, Варшаве, у далейшым працаваў у Нью-Йорку. Большасць яго прац прысвечана філалогіі, змене граматыкі ў БССР. Выключэннем з'явілася кніга-водгук Я.Станкевіча "Савецкае хвальшаванне гісторыі Беларусі" [20] на выхад у 1954 г. у Мінску "Истории Белорусской ССР" і наступнае яго выданне "З гісторыі Беларусі", прысвечанае падзеям дзяржаваўтварэння. Навейшаму перыяду гісторыі ў гэтай кнізе прысвечана апошняя 6-я частка (якая па-сутнасці з'яўляецца скарачэннем папярэдняга выдання) пад назвай "Гісторыя Беларусі і расейская чорная сотня". Назва ўвасабляе перакананне аўтара ў тым, што сапраўднымі ворагамі беларускага народу сталі "расейскія манархістыя і расейскія камуністыя" [21]. (Невыпадкова прафесар І.М.Ігнаценка падкрэсліваў тое, што нацыяналісты "ніколі не былі з народам, а заўсёды выступалі супраць народа ў інтарэсах рэакцыйных імперыялістычных сіл, з якімі іх аб'ядноўвае нянавісць да Савецкай улады, да сацыялізма і камунізма" [22]). Свой крытычны аналіз савецкай гістарыяграфіі дакастрычніцкіх падзей Я.Станкевіч завяршае словамі: "Што з рэвалюцыяй у лютым 1917 г. Беларусы ў Бацькаўшчыне ня ўсюды пры выбарах маглі праявіць сябе так, як гэтага можна было спадзявацца, выясьняецца тым, что тады ўся Беларусь была наваднёная расейскім войскам, а Беларусы-вайскоўцы былі разасланыя на франты паўднявы, румынскі й каўкаскі. Пекла, створанае бальшавікамі ў Беларусі, чарнасоценцы завуць "шчасьлівым жыцьцём пад бальшавіцкай уладаю". Гэтае шчасьце Беларусы заўдзячаюць Маскве. Усё чыста, свае й чужыя, назіральнікі Беларусі згаджаюцца з тым, што калі-б Беларусь ня была пад Расеяй, дык Беларусы не зазналі-б бальшавіцкага раю" [захавана арфаграфія аўтара. – Л.М.] [23]. Сапраўды, мы бачым, што нягледзячы на падкрэсленасць рэпрэзентацыйнасці выдання, ўзгаданы твор Я.Станкевіча мае выразны антысавецкі характар.

Гэтыя далёка не дыпламатычныя выпады выклікалі адмоўную рэакцыю даследчых колаў Беларусі. У гэтым плане трэба ўзгадаць той факт, што напярэдадні святкавання 50-гадовага юбілею БССР ў 1969 г. паміж даследчыкамі Мюнхэна і БССР разгарнулася ўжо сапраўдная ідэалагічная баталія вакол пытання аб першынстве беларускай дзяржаўнасці, у якую былі ўцягнуты імяністыя вучоныя Савецкай Беларусі. Прафесар, доктар гістарычных навук І.М.Ігнаценка ў 1968 г. у цэнтральным органе ЦК КП(б) Б "Звяздзе" ў артыкуле пад разгромнаю назвай "Камедыянты з мюнхенскай падваротні" адзначыў: "Толькі беларускія буржуазныя нацыяналісты, якія знайшлі прытулак на задворках імперыялістаў і абіваюць пароґі сваіх гаспадароў, асепленыя шалёнай нянавісцю да Савецкай улады, не хочуць бачыць поспехаў беларускага народа на шляхах сацыяльнага прагрэсу... І вось цяпер, напярэдадні паўвекавога юбілею БССР [...] спрабуюць прыпісаць сабе галоўную ролю ў стварэнні беларускай дзяржаўнасці, [...] прыкметна актывізавалі брудную кампанію фальсіфікацыі гісторыі беларускага народа ў савецкі перыяд" [24]. Прафесар, доктар гістарычных навук Л.С. Абецадарскі, высвятляючы шляхі ўстанаўлення БССР, таксама неаднаразова звяртаўся да апраўяржэння "мюнхэнскіх казак" так званых "мюнхэнскіх пісак" – "буржуазна-нацыяналістычных фальсіфікатараў гісторыі" [25].

У адказ гістарыяграфічны твор П.Урбана "У святле гістарычных фактаў" (Мюнхен, Нью-Йорк, 1972) абвяргаў версію гісторыі Беларусі, якая была выкладзена Л.С.Абецадарскім у брашуры "У святле неабвержных фактаў" (1969). Аналізуючы стан гістарычных даследаванняў у БССР, П.Урбан і Я.Станкевіч вызначылі два этапы: адносна незалежнае ад цэнтра развіццё да 1930-х нацыянальнай гістарыяграфіі, а ў далейшым – адсутнасць у беларускіх савецкіх вучоных уласнага погляду на гісторыю свайго народа, разгляд яе "*толькі ў рамках вялікадзяржаўных канцэпцый Масквы*".

Канешне, крытыку ў бок савецкага рэжыму можна растлумачыць асабістымі пачуццямі людзей, якія ў час Вялікай Айчыннай вайны сталі па другі бок – супрацоўнічалі з германскімі акупацыйнымі ўладамі. У прыватнасці, Я.Станкевіч і А.Адамовіч былі членамі Беларускай народнай самапомачы, С.Станкевіч займаў пасаду акруговага намесніка Беларускай Цэнтральнай рады ў Баранавічах. (Але, заўважым, што Мюнхен, якому дасталася дурная слава піўнога путчу нацыстаў, у пасляваенны час стаў асяродкам інтэграцыйных працэсаў у Германіі, дзе фашызм, як ідэалогія, асуджаўся). Да непрыняцця камуністаў аўтараў падштурхнулі і неапраўданыя рэпрэсіі – А.Адамовіч быў арыштаваны па сфабрыкаванай справе "Саюза вызвалення Беларусі", В.Жук-Грышкевіч у 1939 г. на восем год быў зняволены органамі НКУС.

З другога боку, нельга забываць пра тое, што Германію спасціглі цяжкія палітычныя крызісы: падзел краіны на ГДР і ФРГ у 1949 г. і ўваход апошняй у склад НАТА ў 1955-м абвастрыў супрацьстаянне сацыялістычных і капіталістычных краін. В.Жук-Грышкевіч у беларускай секцыі радыё "Вызваленне" [26], А.Адамовіч і С.Станкевіч у беларускай рэдакцыі радыё "Свабода" [27], зразумела, праводзілі тыя ідэі, якія адпавядалі антысавецкай кампаніі ўрада ФРГ. Таму нараканні беларускіх даследчыкаў у "прыхлебацельстве" хоць і былі жорсткімі, але мелі пад сабою аснову.

У 1960 – 1980-я гг. заахвочванню даследаванняў па гісторыі Беларусі і публікацыі іх вынікаў садзейнічалі новыя нацыянальныя культурна-навуковыя цэнтры – Інстытут беларусаведы і беларускі музей ў Ляймене (ФРГ). Для інфармавання заходніх палітычных і навуковых колаў у 1979 – 1991 гг. выходзілі ў Боне (ФРГ) гадавыя агляды беларускага савецкага друку. Розныя аспекты сваёй канцэпцыі гісторыі Беларусі даследчыкі з нацыянальнай дыяспары выкладалі на міжнародных форумах па праблемах СССР і Усходняй Еўропы.

Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь паклала пачатак новым узаемаадносінам з вучонымі за мяжой, асэнсаванню іх спадчыны. Практычна гэта выражаецца і ў рэгулярных публікацыях вядомых за мяжою матэрыялаў у часопісе "Спадчына" [28]. В.Кіпель у 1993 г. стаў ганаровым прафесарам Гродзенскага універсітэта. Працэсы нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва на Бацькаўшчыне актывізавалі навукоўцаў беларускай дыяспары ў ФРГ - з'явіліся іх артыкулы ў часопісе "Весткі Інстытута беларусаведы" ў Ляймене.

Канцэптуальныя палажэнні, якія былі выпрацаваны ў замежнай гістарыяграфіі ў пасляваенны час, у асноўным супадаюць з вывадамі, зробленымі непасрэднымі ўтваральнікамі БНР, БССР. Гэта можна растлумачыць агульным прызнаннем за беларусамі права мець уласную дзяржаўнасць, тым, што асноўнай крынічнай базай замежных даследчыкаў былі публікацыі палітычнай эміграцыі 1920-х гг. Многія працы эмігранцкіх вучоных вызначаюцца высокім навуковым узроўнем, хоць асобныя даследаванні носяць адбітак прапагандысцкага характару, не пазбеглі палітычнай прадузятасці, уплыву "халоднай вайны". Зроблены першы крок у распрацоўцы бібліяграфіі замежных выданняў па праблеме. Працы замежных навукоўцаў, нягледзячы на выкарыстанне іншых метадалагічных падыходаў, таксама не пазбаўлены істотных недахопаў – заведама негатыўнага стаўлення аўтараў да бальшавіцкай ідэалогіі і практыкі. Супрацоўніцтва некаторых з аўтараў з германскімі акупацыйнымі ўладамі ў час Другой сусветнай вайны паўплывала на адмоўную ацэнку навуковай вартасці іх канцэпцый.

Замест усладлення акта ўтварэння БССР у жыцці беларусаў, якое практыкавалася ў Савецкім Саюзе, эмігранты-навукоўцы ФРГ усе свае намаганні палажылі на тое, каб як мага болей расказаць свету аб БНР і тых магчымасцях, якія б адкрывала існаванне дэмакратычнай дзяржавы для іх былых суайчыннікаў. І тыя, і другія мелі рацыю, і, як мне здаецца, у 90-я гады мы ўбачылі ў прадстаўнікоў беларускай дыяспары і вучоных Рэспублікі Беларусь жаданне прыйсці да ўзгодненасці пазіцый у трактоўцы беларускага дзяржаўнага генезісу. Пры ўсёй той увазе, якая надавалася ўжо эфемернай БНР, стала важна, каб за мяжою, нягледзячы на сапраўды складаныя абставіны ўтварэння беларускай дзяржавы (такія як неапраўданы

тэрор, тэрытарыяльныя анэксіі бальшавікоў, фармальнасць суверэнітэту Савецкай Беларусі), не "вылілі разам з вадою і дзіця" – БССР. Тое дзіця, якое гадавалася 70 гадоў, каб, нарэшце, адмовіцца ад апекі "старэйшага брата" – РСФСР - і з 1990 года, ужо фактычна ажыццявіць права на самавызначэнне.

У БССР публікацыі замежных аўтараў па беларускаму адраджэнню былі недаступныя чытачу, а пры паступленні ў бібліятэку знаходзіліся ў спецсховішчах. Па ідэялагічных прычынах у савецкі час было немагчыма іх навуковае рэцэнзіраванне. Высновы даследчыкаў падаваліся як фальсіфікацыі "буржуазных нацыяналістаў" і "буржуазных саветолагаў". Крытычнае асэнсаванне навуковай спадчыны германскай дыяспары і зараз немагчыма па прычыне недаступнасці большасці вышэйназваных твораў. Малаверагодна, што ідэалагічныя спрэчкі прыхільнікаў розных сацыяльна-палітычных сістэм ў бліжэйшы час сціхнуць. Але сумесная праца вучоных Рэспублікі Беларусь і даследчыкаў замежжа спрыяе далейшаму развіццю навуковай канцэпцыі беларускага дзяржаваўтварэння, умацаванню нацыянальнай свядомасці.


1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. – Т. 2. - Мн.: БелЭн., 1994. – С. 28.
2. У Нацыянальнай бібліятэцы РБ можна пазнаёміцца з выданнямі газеты "Веда" за 1951 – 1953 гг. і за 1973 г.
3. Недасек Н. Большевизм в революционном движении Белоруссии. - Исследования и материалы: Сер. 1 / Ин-т по изучению ист. и культуры СССР. - Вып. 25. - Мюнхен, 1956. – 151 с. - С.4. У Энцыклапедыі гісторыі Беларусі дапушчана памылка ў напісанні псеўданіма А.Адамовіча – "Недасек Г." замест – "Недасек Н.". (Гл.: Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 1. – Мн., 1993. – С. 44).
4. Віцьбіч Ю. Як з'явіўся на мапе Беларускі Дзяржынск [Аб Койданаўскім паўстанні ў ліпені 1920 г.] // Бацькаўшчына. – 1952. - № 25/26; ён жа. Сорак год таму паўсталі Вяліжане // Бацькаўшчына (Мюнхэн). – 1958. - № 49(50).
5. Со святыми упокой // Религия и атеизм в СССР. Ежемесячный обзор (Мюнхен). – 1976. – Октябрь.
6. БНР у дакументах // Бацькаўшчына. - 1949. - №№ 12-16; 1950. - №№ 1-2.
7. Недасек Н. Очерки истории большевизма в Белоруссии. I. Большевизм на путях к установлению контроля над Белоруссией. Исследования и материалы: Сер. 1 / Ин-т по изучению ист. и культуры СССР. - Мюнхен, 1954; ён жа. Большевизм в революционном движении Белоруссии. - Мюнхен, 1956.
8. Недасек Н. 1917-1947: Да 30-х угодкаў найвызначальных падзеяў нашага нацыянальнага руху. – Б.м.: Бацькаўшчына, Б.г. – 20 с. – С.12.
9. Недасек Н. 1918-1948: Да трыдцатых угодкаў найвызначнейшых падзеяў нашага нацыянальнага руху. – Б.м.:Бацькаўшчына, Б.г. [Ч.] 1 : Да 25 сакавіка. – 23 с.
10. Недасек Н. Камунізм і "беларускі нацыяналізм" // Запісы БІНІМ. – Кн. 1. – Мюнхэн, 1962.
11. Адамовіч А. "Як дух змагання Беларусі" (да 100-х угодкаў нараджэньня Івана Луцкевіча). - Нью-Йорк, 1983.
12. Станкевіч С. Нацыянальная палітыка Крэмля на Беларусі // Беларускі зборнік. - 1955. - Кн. 1.
13. Паланевіч Г. Нацыянальная тэорыя й практыка бальшавізму ў Беларусі // Беларускі зборнік. - 1960. - Кн.12.
14. Урбан П. Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка // Беларускі зборнік - 1959. - Кн. 10.
15. Валаціч М. Польская спроба захопніцтва Беларусі ў пару тварэньня Беларускай Народнай Рэспублікі // Бацькаўшчына. - 1958. - № 11-13. - С. 3.
16. Валаціч М. Лінія Керзона на фоне падзеяў і тэрытарыяльных зьменаў на Ўсходзе Эўропы // Беларускі зборнік. - 1955. - Кн. 3. - С. 90.
17. Менскі Я. Чаму ды як была ўтворана Беларуская ССР // Беларускі зборнік. - 1955. - Кн. 1. - С. 16.
18. Урбан П. Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка // Беларускі зборнік - 1959. - Кн. 10.
19. Жук-Грышкевіч В. 25 сакавіка. - Мюнхен, 1978.
20. Станкевіч Я. Савецкае хвальшаванне гісторыі Беларусі. Доследы і матэрыялы: Сер. 2 / Ін-т для вывучэння СССР. - № 51. – Мюнхэн, 1956. - 185 с.
21. Станкевіч Я. З гісторыі Беларусі. – Мюнхен: Бацькаўшчына. Б.ц., 1958. – 112 с. – С. 86.

22. Ігнаценка І. Камедыянты з мюнхенскай падваротні. - С. 2.
23. Станкевіч Я. З гісторыі Беларусі. – Мюнхен: Бацькаўшчына. Б.ц., 1958. – 112 с. - С. 112.
24. Ігнаценка І. Камедыянты з мюнхенскай падваротні // Звязда. – 1968. – 6 чэрвеня. - С. 2.
25. Абецадарскі Л.С. У святле неабвержаных фактаў. – Мн., 1969. Пераклад на рускую мову прыйшоўся падчас новай антынацыяналістычнай кампаніі. (Гл.: Абецедарский Л.С. В светле неопровержимых фактов // Дары данайцев. – Мн.: Беларусь, 1987. – С. 24-89.
26. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 3. - Мн., 1996. – С. 373.
27. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 6. - Мн., 2001. – С. 404.
28. Віцьбіч Ю. Вяліжскае паўстанне // Спадчына. – 1997. - № 2. – С. 73-98; Недасек Н. 1917-1947: Да 30-х угодкаў найвызначальных падзеяў нашага нацыянальнага руху // Спадчына. - 1998. - № 1. - С. 51-74; ён жа. Камунізм і «беларускі нацыяналізм» // Спадчына. – 2000. - № 2. – С. 3-36 і інш.

# К ВОПРОСУ О ВОЗРАСТЕ НЕМЕЦКОГО ЯНТАРЯ

А.А. Богдасаров, М.А.Богдасаров
*г. Брест, БрГУ им. А.С. Пушкина*

До последнего времени считалось, что янтарь и янтареподобные смолы образовались в мел-палеогеновое время – 70-40 млн. лет назад. В геологических отложениях этих периодов ископаемые смолы встречаются в глауконитовых глинах, углистых образованиях, песчано-глинистых породах, средне- и мелкозернистых песках с галькой и гравием. Так уж распорядилась геолого-геохимическая обстановка эпохи янтареобразования, что основные промышленные запасы янтаря (около 95%) сосредоточены в Калининградской области России, входящей в основной ареал распространения янтаря в мире – Балтийско-Днепровскую янтареносную провинцию которая охватывает территорию Дании, юг Швеции, север Германии, практически всю Польшу, Литву, юг Латвии, юго-запад Беларуси и большую часть правобережной Украины [1]. Основным источником янтаря здесь являются древние погребенные прибрежно-морские и лагунно-дельтовые россыпи палеогенового возраста (Пальмникенское и Приморское месторождения в Прибалтике, Клесовское месторождение в Украине, значительные проявления на территории Польши и Беларуси). Кроме того, янтарные скопления и проявления отмечены в Румынии, Чехии, Италии, Бирме, Сахалине, арктическом побережье России (Канин-нос, Амдерма), Доминиканской республике, Мексике и других точках мира.

Общепринятой классификации ископаемых янтареподобных смол до настоящего времени не создано [2]. В наиболее полной классификации Н.А.Орлова и В.А.Успенского [3] ископаемые смолы, не растворяющиеся полностью ни в одном растворителе, подразделяются на три самостоятельных семейства:

1) Янтари (сукцинит, румэнит, бирмит, симетит и др.) – мел-палеогеновые вязкие смолы, содержащие в себе до 8-10% янтарной кислоты, широко применяемые как в ювелирном деле, так и в химической промышленности.

2) Ретиты (ретинит, геданит и др.) – палеогеновые хрупкие смолы, в основном, используемые в химической промышленности.

3) Копалиты (копал, амбрит и др.) – хрупкие смолы четвертичного возраста, используемые только в химической промышленности.

Собственно сам янтарь (сукцинит) представляет собой преимущественно палеогеновую ископаемую смолу определенных видов хвойных деревьев, которая в процессе фоссилизации утратила большую часть летучих компонентов. Янтарь – это аморфный углерод, соответствующий химической формуле $C_{10}H_{16}O$. В качестве основного классификационного признака янтаря (сукцинита) в минералогии используется его растительное происхождение, что впервые нашло отражение в минералогической системе Н.Я.Берцелиуса [4]. В дальнейшем генетический принцип стал ведущим и отмечен в ряде важнейших работ по минералогии органических соединений [3,5,6].

Геологический возраст янтаря и ископаемых смол, известных практически на всех континентах мира, определяется возрастом осадков, в которых их находят. Однако сами эти